**Тэма:** Будаўніцтва новага жыцця

**Мэты:**

1)Пазнаёміць вучняў са зменамі на тэрыторыі Беларусі пасля Кастрычніцкай рэвалюцыіі, пра развіцце дзяржавы ў 20-30 гг, вызначаць галоўныя падзеі гэтага перыяда жыцця.

2)Развіваць лагічнае мысленне, уменне працаваць з гістарычнай картай, выдзяляць галоўнае ў вывучаемым матэрыяле, памяці, уважлівасць.

3)Выхоўваць гонар, цікавасць вучняў да гэтага часу.

**Ход урока:**

**1.Арганізацыя пачатку ўрока**

**1.1. Прывітанне**

- Весела гучыць званок,
  Яго голас нам знаёмы,
  Запрашае на ўрок
  З беларускай мовай!

-Добры дзень, нагадваю, што сення на ўроку мы размаўляем па беларуску. Сядайце, калі ласка. Праверце сваю пасадку.

**1.2. Стварэнне спрыяльнага эмацыйнага настрою вучняў**

**3. Паведамленне тэмы і мэт урока.**

-На дошцы вы бачыце стужку часу. На якой адрэзак часу я паказваю?

-1920-1930-я гг.

-Як вы лічыце, чаму?

-На гэтым ўроку мы будзем гаворыць пра яго.

-Правільна. У гэтыя годы наша дзяржава дасягнула вельмі вялікіх поспехаў у сваім разіцці. І на гэтым ўроку мы даведаемся пра іх, а галоўнае, чаму яна іх дасягнула і якая падзея спрыяла гэтаму. А яшчэ пазнаёмімся з новымі абрэвіатурамі. Яны *запісаны на дошцы*. Давайце прачытаем іх.

-БССР, СССР.

-Мабыць нехта ўжо ведае што яны абазначаюць?

**-** Сёння на ўроку вы даведаецеся пра: утварэнне БССР і СССР, пра развіццё прамысловасці, пра змены ў жыцці сялян, а таксама пра развіццё беларускай культуры. Тэма ўрока “Будаўніцтва новага жыцця”.  (Слайд 1)

- А працаваць мы будзем па плане: (Слайд 2 )

-Паглядзіце на дошку, прачытайце пытанне ?

-Будзьце уважлівамі, а у канцы ўрока мы вернемся да гэтага пытання.

 “чаму ж  наша рэспубліка дабілася такіх поспехаў у будаўніцтве новага. жыцця?”

 **4. Вывучэнне новага матэрыялу.**

**4.1. Утварэнне СССР і БССР**

-Цяжкае было жыццё людзей у мінулыя часы якое прывяло да таго, што яны вырашылі шляхам узброенай барацьбы змяніць дзяржаўную ўладу ў краіне і пачаць будаўніцтва новага жыцця. Такая змена дзяржаўнай улады называецца **рэвалюцыяй.** У 1917 годзе 7 лістапада адбылася рэвалюцыя – падзея, якая прыводзіць да вялікіх змен у грамадстве. Многія людзі жылі бедна, цяжка, яны працавалі шмат на фабрыках, але ім амаль нічога не плацілі за гэта, а іх ўраджай забіралі багатыя людзі і яны былі вельмі незадаволеныя гэтым, таму выходзілі на вуліцы і бунтавалі. З-за гэтага ўлада цара, які кіраваў у той час, была звергнута, (слайд 5) а потым да ўлады прыйшоў  Уладзімір Іліч Ленін і людзі, якія яго падтрымлівалі. У Беларусі ўсталявалася савецкая ўлада. Рабочыя і сяляне пачалі будаваць новае жыццё. Цяпер дзень 7 лістапада, калі адбывалася рэвалюцыя, з’яўляецца святочным днём.

- 1 студзеня 1919 годзе была створана Беларуская Савецкая Сацыялістычная Рэспубліка – БССР. Гэта дзяржава паклала пачатак самастойнаму жыццю беларускага народа.

-  30 снежня  1922 БССР і іншыя савецкія рэспублікі аб’ядналіся і ўтварылі адну вялікую дзяржаву – Саюз Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік (СССР)

У складзе Савецкага Саюза працоўныя нашай краіны будавалі гарады, заводы, фабрыкі, электрастанцыі. Было цяжка, аднак людзей не пакідала надзея на лепшую будучыню.

У паўднёвай частке Беларусі была створана БССР, а заходняя Беларусь была

захоплена спачатку нямецкімі войскамі. Потым у пачатку 20 стагоддзя адбылася Першая сусветная вайна і гэта частка адыйшла да Польшы.

**4.2.Развіцце прамысловасці**

- Працуем далей. Пераходзім да другога пункта нашага плана: развіццё прамысловасці.

-Існуе некалькі відаў прамысловасці:

Лёгкая прамысловасць – рэчы, якімі карыстаюцца шмат людзей і вельмі часта, напрыклад, абутак, адзенне тканіна. Прачытайце пра лёгкую прамысловасць у другім абзацы на старонцы 101.

-Гэтыя прадпрыемствы працуюць і зараз.

-Наступны від прамысловасці - харчовая прамысловасць. Як вы лічыце што выробляюць на прадпрыествах харчовай прамысловасці?

+ Прадукты харчавання.

-Добра. Знайдзіце радкі пра харчовую прамысловасць у другім абзацы на старонцы 101 .

- Правільна. А каб працавалі заводы і фабрыкі патрэбны станкі, іх выпускаюць прадпрыемства цяжкай прамысловасці. Давайце прачытаем аб гэтым у апошнім абзацы на старонцы 101.

**4.3.Змены ў жыцці сялян**

-Вось, мы перахлдзім да наступнага пункта плана. А зараз паглядзіце на слайд, вось колько прадпрыемстваў пачалі сваю працу ў 1920-1930 гады. Прамысловасць развівалася.

(слайд 8 )

- (слайд9) З прыходам у Беларусь савецкай ўлады пачалося стварэнне калектыўных гаспадарак – калгасаў і саўгасаў

(слайд10)

Калгас – гэта калектыуная гаспадарка

Саўгас – савецкая дзяржаўная гаспадарка

- Давайце зробім вынік. Навошта трэба былі калгасы і саўгасы, якія знаходзіліся ў вёсках?

+ Яны давалі гораду прадукты харчавання і сыравіну.

**4.4. Развіццё беларускай культуры.**

-Вось мы з вамі  разглядзелі 3 пункт плана. А цяпер мы пераходзім да апошняга: развіццё беларускай культуры.

У гарадах і вёсках будаваліся новыя школы, бібліятэкі, тэ атры, музеі. Для працы на заводах і фабрыках патрабаваліся інжынеры і іншыя спецыялісты. Адкрывалася шмат навучальных устаноў.

- Давайце прачытаем апошні абзац на старонцы 103. Что ж адбывалася з мовай?

Дзяржаўнымі мовамі ў БССР у 1920—1930-я гады сталі беларуская, руская, яўрэйская, польская. А ўсё таму, што ў Беларусі жылі людзі розных нацыянальнасцяў. Дружба дапамагала ім будаваць новае жыццё, развіваць гаспадарку і  культуру нашай краіны.

-А хто ведае колькі зараз у нас дзяржаўных моў?

-Якія гэта?

+Руская і беларуская

- Добра, такім чынам, дзеці, дзень 1 мая стаў  Святам працы. Дзякуючы стараннай працы беларусаў паступова мацнла Беларуская Савецкая Сацыялістычная Рэспубліка.

**5. Замацаванне вывучанага матэряла.**

-Зараз, алкрыйце свае рабочыя сшыткі на стр.

**6. Падвядзенне вынікаў урока.**

**6.1.Абагульняючая гутарка**

- Дык давайце звернемся да пытання, якое я вам агучыла ў пачатку ўрока “Чаму наша рэспубліка дабілася такіх вялікіх поспехаў у будаўніцтве новага жыцця?”

+ Дзякуючы стараннай працы беларусаў, дапамозе іншых краін і наадзее на лепшае будучае.

-Як вы лічыце, чаму тэма называецца будаўніцтва новага жыцця?

- Таму, што адбылася рэвалюцыя, якая змяніла ўсе.

-ады, заводы, фабрыкі, электрастанцыі, прамысловыя прадпрыемствы. Яны і сення вырабляюць патрэбную для ўсіх прадукцыюУ гэтыя гады ў Савецкім Саюзе пачала актыўна развівацца прамысловасць: будаваліся гар.

-Малайцы.

**6.2.Рэфлексія.**

Зараз я прапаную вам ацаніць сваю працу на ўроку, перад вамі ляжаць рознакаляровыя кругі, калі урок вам не спадабаўся, многа было незразумела, падніміце блакітны кружок, а калі урок спадабаўся, цяжкасцей у атрыманні ведаў не было, то зялёны.

**7. Інструктаж па дамашнім заданні.**

-Дома вам патрэбна прачытаць тэму “Будаўніцтва новага жыцця” і адказаць на 5-7 пытанні.